View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by BSU Digital Library

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»*

28 лютага 2011 года, № 4 (2042)

## ФОТАФАКТ



Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

***Дошка гонару БДУ ўрачыста адкрыта 22 лютага ва ўнутраным дворыку Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Цырымонія прайшла з удзелам рэктара акадэміка Сяргея Абламейкі. На Дошку гонару занесены фотаздымкі 64 супрацоўнікаў і навучэнцаў (па 32 чалавекі ў кожным спісе). Такой пашаны яны ўдастоены за заслугі і дасягненні ў адукацыйнай, навуковай, метадычнай, інавацыйнай і кіраўніцкай дзейнасці па выніках 2010 года. Стварэнне Дошкі гонару – адна са значных падзей у праграме святкавання 90-годдзя БДУ, якое адзначаецца сёлета.***

Чытайце ў нумары:

ГЕРОІ СССР І БДУ

Другая частка нарыса пра выкладчыкаў БДУ, якія за свае ратныя подзвігі падчас вайны ўшаноўваліся званнем Героя Савецкага Саюза

Стар. 2

СВЯТЛО НЕЗГАСАЛЬНАЕ Ў СЭРЦЫ МАІМ

Тыдзень беларускай мовы прайшоў у БДУ 21–25 лютага

Стар. 3

«ШАХМАТЫ – ГЭТА ВЫДАТНАЯ ГІМНАСТЫКА ДЛЯ РОЗУМУ!»

Інтэрв'ю з гросмайстрам і маладым выкладчыкам Інстытута журналістыкі БДУ Вольгай ГЕРАСІМОВІЧ

Стар. 4

## ПАДЗЕЯ

# Святыні веры перададзены ў БДУ

***Урачыстае ўручэнне факсімільнага выдання Слуцкага Евангелля XVI стагоддзя Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту адбылося 17 лютага ў зале пасяджэнняў Вучонага савета.***

У цырымоніі прынялі ўдзел рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, першы прарэктар Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірылы БДУ епіскап Бабруйскі і Быхаўскі Серафім, намеснік старшыні Грамадскага савета па маральнасці ў нашай краіне выканаўчы дырэктар выдавецтва Беларускага Экзархата Уладзімір Грозаў і мастацкі кіраўнік камернага духоўнага тэатра гэтага выдавецтва Наталля Башава.

Праграма мерапрыемства была арыгінальнай і відовішчнай. Акцёры Камернага духоўнага тэатра падрыхтавалі тэатралізаваную прэзентацыю Евангелля, насычаную рэаліямі часу яго стварэння. Быў паказаны таксама дакументальны фільм аб праекце Беларускай праваслаўнай царквы «Сям'я – Яднанне – Айчына». Акрамя таго, фае рэктарата ўпрыгожыла выстава духоўна-асветніцкай літаратуры выдавецтва Беларускага Экзархата і Фундаментальнай бібліятэкі БДУ. Завяршальным акордам стала выступленне мужчынскага вакальнага ансамбля «Дабравест».

**ДАВЕДКА**

Слуцкае Евангелле – унікальны рукапісны помнік XVI стагоддзя, у 1581 г. перапісаны ўласнаручна ў Слуцку князем Юрыем Алелькавічам. Яно захоўвалася ў рызніцы Слуцкага Свята-Траецкага мужчынскага манастыра. Пасля рэвалюцыі 1917 г. Евангелле перададзена ў Мінскі дзяржаўны музей, які затым быў пераведзены ў Магілёў. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны кнігу разам з іншымі музейнымі каштоўнасцямі вывезлі. Доўгі час рукапіс лічыўся страчаным. Знайшоўся ён у пачатку нашага стагоддзя ў адной жыхаркі Мінска. У 2009 г. выдавецтва Беларускага Экзархата падрыхтавала і выпусціла ў свет факсімільнае выданне Слуцкага Евангелля. У 2010 г. за ўзнаўленне і выданне гэтага рарытэта Беларуская праваслаўная царква ўдастоена найвышэйшай узнагароды ў галіне нацыянальнага кнігавыдання «Залаты фаліянт» і найвышэйшай узнагароды на міжнародным кніжным конкурсе «Мастацтва кнігі СНД» у Маскве.



Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

## Весткі з рэктарата

ПАГАДНЕННЕ аб супрацоўніцтве паміж БДУ і БПС-Банкам падпісана 16 лютага рэктарам акадэмікам Сяргеем Абламейкам і старшынёй праўлення БПС-Банка Васілём Мацюшэўскім. Яно прадугледжвае стварэнне ўмоў для развіцця навучальнай інфраструктуры, падрыхтоўкі спецыялістаў у розных галінах банкаўскай дзейнасці і эканомікі. Супрацоўнікі БДУ будуць выконваць даследаванні для банка, а банк – даваць магчымасць для праходжання студэнтамі практыкі, прымаць на стажыроўку выкладчыкаў і аспірантаў, прызначаць стыпендыі найлепшым студэнтам ВНУ па шэрагу спецыяльнасцяў.

* * *

СПЕЦЫЯЛЬНЫ прадстаўнік прэзідэнта РФ па міжнароднай садружнасці ў Арктыцы і Антарктыцы, дэпутат Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу Расіі, прэзідэнт Дзяржаўнай палярнай акадэміі Артур Чылінгараў 14 лютага быў госцем БДУ.

Ён сустрэўся з кіраўніцтвам і выступіў з лекцыяй перад студэнтамі геаграфічнага факультэта. Вядомы палітык і палярнік распавёў пра свае экспедыцыі, даследчыя работы на арктычных станцыях.

* * *

БУЙНАЯ дэлегацыя КНР на чале з намеснікам начальніка Дзяржаўнай канцылярыі па міжнароднай распаўсюджванні кітайскай мовы прарэктарам Чжэцзянскага педуніверсітэта Лінь Чжаацзынем гасцявала ў БДУ з 17 па 21 лютага.

Візіт прымеркаваны да скончэння святкавання Новага года па ўсходнім календары («Чуньцзэ»), ці знакамітага свята ліхтароў. У фае рэктарата была арганізавана выстава жывапісу і плакатаў, прысвечаная КНР, а ў актавай зале ліцэя БДУ адбыўся канцэрт, падрыхтаваны выкладчыкамі і студэнтамі інстытута музыкі з Чжэцзянскага ўніверсітэта.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## ТВОРЧАСЦЬ

# Дотык да палітры

***Выстава жывапісу, графікі і скульптуры адкрылася 21 лютага ў будынку рэктарата БДУ.***

Аўтары прац – вядомыя майстры, члены Беларускага саюза мастакоў жывапісцы Уладзімір Кожух, Аляксандр Ксяндзоў, Марыя Ісаёнак, Надзея Лівенцава, Сяргей Лагуновіч-Чарапко, графікі Канстанцін Шаранговіч, Уладзімір Мяховіч, Сяргей Балянок, Сяргей Стальмашонак і скульптары Уладзімір Слабодчыкаў і Аляксандр Фінскі.

Арганізатар выставы – Саюз жанчын БДУ – рыхтаваў яе як свой традыцыйны падарунак да Дня абаронцаў Айчыны і Дня жанчын. Але яна мае яшчэ адно прысвячэнне: удзельнікі выставы шануюць памяць свайго сябра і калегі жывапісца Юрыя Макарава, 55-годдзе з дня нараджэння якога адзначаецца ў гэтым годзе. Палотны гэтага мастака таксама прадстаўлены ў экспазіцыі.

Юрый Макараў доўгі час выкладаў у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (цяпер – Беларуская акадэмія мастацтваў). У апошнія гады жыцця з 1999 па 2001 гг. ён вёў мастацкую студыю ў студэнцкім гарадку БДУ. Студыя, створаная Юрыем Макаравым, працягвае працаваць і цяпер.

Выстава арганізавана ў межах праграмы «Дотык да палітры», мэта якой – знаёміць супрацоўнікаў і студэнтаў з сучасным выяўленчым мастацтвам. Каардынатар гэтай акцыі – доктар юрыдычных навук прафесар кафедры экалагічнага і аграрнага права Тамара Макарава.

**Анастасія ГАЛУБОВІЧ**

ДА 90-ГОДДЗЯ БДУ

# Героі СССР і БДУ

## Частка 2



***У Беларускім дзяржаўным універсітэце заўсёды працавалі і працуюць шмат вядомых асоб. Аднак Героі Савецкага Саюза складаюць асобную катэгорыю, бо дзякуючы іх воінскім подзвігам мы маем магчымасць мірна жыць і тварыць у роднай краіне.***

### КАТЛАВЕЦ МІХАІЛ ПАЎЛАВІЧ



Нарадзіўся 25 кастрычніка 1914 г. у вёсцы Лешня Мазырскага раёна Гомельскай вобласці. У 1937 г. закончыў БДУ. У Чырвонай Арміі з 1938 г. У 1941 г. закончыў курсы малодшых лейтэнантаў пры Харкаўскім танкавым вучылішчы.

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з чэрвеня 1941 г. – на Заходнім, Сталінградскім і 2-м Украінскім франтах. Камандзір танкавага батальёна капітан М. П. Катлавец вызначыўся 7 студзеня 1944 г. у баі за чыгуначную станцыю Лялекаўка (на захад ад Кіраваграда), знішчыў 7 танкаў і адбіў 6 контратак.

13 красавіка 1944 г. давераны гвардыі капітану Катлаўцу М. П. танкавы батальён паспяхова фарсіраваў раку Днестр у раёне сяла Ташлык Грыгорыяпольскага раёна Малдаўскай ССР, захапіўшы плацдарм на яго заходнім беразе, прарваў абарону праціўніка на румына-савецкай мяжы.

Гвардыі капітан Катлавец М. П. асабіста падбіў 4 танкі і 2 самаходныя артылерыйскія ўстаноўкі ворага.

У час прарыву варожай сілы на румына-венгерскай мяжы 5 кастрычніка 1944 г. яго батальён знішчыў 5 гармат, больш за 100 павозак з боепрыпасамі, узяў у палон 130 гітлераўцаў. М. П. Катлавец загінуў у баі 6 кастрычніка 1944 г. Пахаваны ў г. Цірасполь у брацкай магіле.

Званне Героя Савецкага Саюза Міхаілу Паўлавічу Катлаўцу прысвоена 24 сакавіка 1945 г. за ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання на фронце барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі і праяўленыя пры гэтым мужнасць і геразм.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Яго імем названы вуліцы ў Цірасполі, Мазыры, вёсцы Лешня Мазырскага раёна.

### ОСІПАВА МАРЫЯ БАРЫСАЎНА



Нарадзілася 27 снежня 1908 г. у пасёлку Сярковіцы Талачынскага раёна Віцебскай вобласці. Скончыла Вышэйшую камуністычную сельскагаспадарчую школу Беларусі (1935) і Мінскі юрыдычны інстытут (1940). Да мая 1941 г. была членам Вярхоўнага Суда Беларускай ССР. Напярэдадні вайны – асістэнт юрыдычнага інстытута.

У ліпені 1940 г. з ліку былых выкладчыкаў і студэнтаў юрыдычнага інстытута сфарміравалі падпольную групу ў Мінску. Адна з арганізатараў аперацыі ў верасні 1943 г. па знішчэнні Вільгельма фон Кубэ. Марыя Осіпава была непасрэдным выканаўцам акцыі. Яна, рызыкуючы жыццём, пранесла міну з хімічным узрывальнікам праз гітлераўскія пасты і перадала яе Алене Мазанік.

«Суседзі ведалі, чым займаецца Осіпава. Не маглі не ведаць. У яе кватэры ўвесь час тоўпіліся яўрэі, прыходзілі сувязныя з партызанаў. Але ніхто не выдаў. Наадварот, стараліся дапамагчы, выратаваць. Калі фашысты пачалі знішчаць яўрэяў, Осіпава забірала да сябе на кватэру і дарослых, і дзяцей. Карміць не было чым — Тома, яе 12-гадовая дачушка, хадзіла збіраць ежу. Жабравала — а што было рабіць?..

Я чытала лісты ад яўрэяў, якія засталіся жывымі дзякуючы Осіпавай. Яе кватэра была сапраўдным перасыльным пунктам, дзе ўцекачы атрымлівалі аўсвайсы».

Осіпавай было прысвоена ганаровае званне Ізраіля «Праведнік свету».

Званне Героя Савецкага Саюза Марыі Барысаўне Осіпавай прысвоена 20 снежня 1943 г.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны знаходзілася на партыйнай рабоце: была дэпутатам Вярхоўнага савета БССР II–V скліканняў, членам Вярхоўнага Суда БССР, рэспубліканскага Камітэта аховы міру.

Узнагароджана ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны I ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі.

Памерла 5 лютага 1999 г. Яе імем названа вуліца ў г. Давыд-Гарадок.

М. Б. Осіпава – ганаровы грамадзянін горада-героя Мінска (1968 г.) і горада Нурэк (Таджыкістан). Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 1 чэрвеня 1999 г. № 825 на доме па вул. Кісялёва ў Мінску, у якім жыла М. Б. Осіпава, усталявана мемарыяльная дошка.

### ПАРАХНЕВІЧ УЛАДЗІМІР АЛЯКСЕЕВІЧ



Нарадзіўся 18 студзеня 1918 г. у в. Аўсімавічы Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці. Скончыў фізіка-матэматычны факультэт БДУ ў 1941 г. Са жніўня 1941 г. у падпольнай групе (Варатынскі сельсавет, Бабруйскі раён), з ліпеня 1942 г. – баец, затым камандзір дыверсійнай групы 537-га партызанскага атрада брыгады імя С. М. Кірава (Магілёўская вобласць). Пад яго кіраўніцтвам група пусціла пад адхон на ўчастку чыгункі Бабруйск–Жлобін 21 варожы эшалон. З лістапада 1943 г. з'яўляўся палітруком роты 539-га атрада 9-й партызанскай брыгады імя С. М. Кірава.

У студзені 1942 г. У. А. Парахневіча прызначылі камандзірам падрыўной групы. Адзін за адным ляцелі пад адхон варожыя цягнікі. Група Парахневіча займалася і іншай «працай»: грамілі варожыя гарнізоны, падбіралі папаўненне ў атрад, вучылі, клапаціліся пра харчаванне, зброю.

Аднойчы Парахневічу давялося, седзячы на неўзарванай 50-кілаграмовай бомбе, якая праляжала паўтара года ў зямлі, дзяўбці зубілам іржу, каб здабыць каштоўны для партызанаў тол! І так 4 бомбы! Кожны ўдар мог стаць апошнім...

Званне Героя Савецкага Саюза Уладзіміру Аляксеевічу Парахневічу прысвоена 15 жніўня 1944 г.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся на камсамольскай і педагагічнай працы ў Мінску. Займаў пасаду дырэктара СШ № 21 г. Мінска. Удастоены звання «Заслужаны настаўнік БССР».

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Памёр 28 ліпеня 1980 г. Яго імем названа вуліца ў Мінску.

### ПАТРЫН АЛЯКСЕЙ ФЁДАРАВІЧ



Нарадзіўся 2 мая 1910 г. у с. Борскае Борскага раёна Самарскай вобласці. Скончыў 8 класаў, два курсы аграрлесамеліярацыйнага інстытута. Працаваў прарабам-лесаводам. У Чырвонай Арміі з 1933 г. З верасня 1940 г. па чэрвень 1941 г. вучыўся ў Артылерыйскай акадэміі імя Дзяржынскага. У гады Вялікай Айчыннай вайны служыў на 1-м Украінскім фронце начальнікам штаба палка, начальнікам штаба артылерыі стралковай дывізіі. 576-ы артылерыйскі полк пад камандаваннем маёра Патрына 3 лістапада 1943 г. у с. Люцеж Вышгародскага раёна Кіеўскай вобласці агнём забяспечыў прарыў варожай абароны і падтрымку наступлення стралковых часцей Чырвонай Арміі.

Званне Героя Савецкага Саюза Аляксею Фёдаравічу Патрыну прысвоена 10 студзеня 1944 г.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны працягваў службу ў Савецкай Арміі. З 2 красавіка 1952 г. па 14 ліпеня 1955 г. працаваў начальнікам вучэбнай часткі і выкладаў курс артылерыі на спецкафедры БДУ.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга (тройчы), Чырвонай Зоркі і медалямі.

Памёр 26 жніўня 1959 г. Яго імем названа вуліца ў с. Борскае Самарскай вобласці.

### СМУШКЕВІЧ ЯКАЎ УЛАДЗІМІРАВІЧ



Нарадзіўся 1 красавіка 1902 г. у мястэчку Ракішкі Нова-Аляксееўскага павета Ковенскай губерні. У 1918 г. добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію.

Пасля заканчэння Грамадзянскай вайны служыў у арміі, з 1922 г. у 4-й знішчальнай эскадрыллі, якая знаходзілася ў Мінску.

У сталіцы ён вырашыў працягваць агульнаадукацыйную падрыхтоўку і паступіў на факультэт грамадскіх навук БДУ. Вучыўся на праваым аддзяленні з 1923 г. па 1926 г. У 1926 г. яго прызначылі ваенным камісарам толькі што створанай у Смаленску авіяцыйнай брыгады. Праз пяць гадоў ён узначаліў 201-ю (пазней «Імя СНК БССР») авіябрыгаду, якая базіравалася ў Віцебску. Адсюль восенню 1936 г. Я. У. Смушкевіч накіраваўся ў Іспанію, дзе змагаўся ў шэрагах рэспубліканскіх войскаў, праявіў сябе выдатным авіяцыйным военачальнікам і сапраўдным майстрам паветранага бою.

У 1936–1937 гг. Я. У. Смушкевіч прыняў удзел у грамадзянскай вайне ў Іспаніі на баку рэспубліканскага кіраўніцтва – старшым ваенным дарадчыкам па авіяцыі, кіраўніком супрацьпаветранай абароны Мадрыда, дзе хутка заваяваў аўтарытэт і павагу. Вучыў іспанскіх сяброў згодна з прынцыпам «Рабі, як я!», здзіўляючы іх сваёй адвагай і баявым майстэрствам. Відавочцы тады пра яго казалі: «Якая моц! Якое шаленства! Такія, як Дуглас (псеўданім Смушкевіча ў Іспаніі), змагаюцца за чыстую справу, я гэта адчуваю, я гэта бачу...» (Эрнест Хемінгуэй). «Імя генерала Дугласа – героя Гвадалахары – будзе вечна жыць у сэрцах іспанцаў» (Энрыка Лістэр).

21 чэрвеня 1937 г. быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза за праяўленую мужнасць і геразм пры выкананні інтэрнацыянальнага доўгу. У баях на р. Халхін-Гол камандаваў авіяцыйнай групай. За паспяховае выкананне баявых заданняў ён быў узнагароджаны другім медалём «Залатая Зорка» (17 лістапада 1939 г.). З лістапада 1939 г. з'яўляўся начальнікам ВПС Чырвонай Арміі, памочнікам начальніка Генштаба па авіяцыі. Адзін з першых, хто двойчы стаў Героем Савецкага Саюза, генерал-лейтэнант авіяцыі, кандыдат у члены ЦК ВКП(б), дэпутат Вярхоўнага Савета СССР першага склікання. У пачатку чэрвеня 1941 г. Я. У. Смушкевіч быў арыштаваны, асуджаны і восенню вывезены ў Куйбышаў, дзе 28 кастрычніка 1941 г. расстраляны.

Рэабілітаваны ў 1954 г. Бронзавы бюст героя ўстаноўлены ў горадзе, дзе ён нарадзіўся. У гонар Смушкевіча названа судна-рэфрыжэратар «Якаў Смушкевіч» і адна з вуліц Віцебска.

### ФІЛІМОНАЎ АЛЯКСАНДР АНДРЭЕВІЧ



Нарадзіўся 9 мая 1918 г. у в. Кучын Кармянскага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў 10 класаў (да вайны), Арлоўскае танкавае вучылішча ў 1942 г.

У Чырвонай Арміі з ліпеня 1941 г. Камандзір роты 55-га гвардзейскага танкавага палка (4-я танкавая армія, 1-ы Украінскі фронт), адзначаны ў баях на Берлінскім напрамку. Рота пад яго камандаваннем 16 красавіка 1945 г. фарсіравала р. Нэйсе, а 18 красавіка – р. Шпрэе. Прасоўваючыся на Берлін, танкісты знішчылі ачагі варожага супраціўлення ў гарадах Лукенвальд, Беліц. Адбіўшы контратакі праціўніка, які імкнуўся прарвацца да акружанай групіроўкі, рота нанесла яму значны ўрон. А. А. Філімонаў прымаў удзел у вызваленні Прагі.

Званне Героя Савецкага Саюза Аляксандру Андрэевічу Філімонаву прысвоена 27 чэрвеня 1945 г.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны жыў у Мінску. У 1949 г. скончыў філалагічны факультэт БДУ, у 1952 г. – аспірантуру. Доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік Міжнароднай славянскай акадэміі навук, адукацыі, мастацтва і культуры. З 1952 г. працаваў выкладчыкам у вышэйшых навучальных установах Мінска, з 1969 г. – старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны I і II ступені, Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі.

А. А. Філімонаў – адзін з аўтараў трохтомнай працы «Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны» і пяцітомнай «Гісторыі Беларускай ССР».

Памёр 31 снежня 2007 г. Пахаваны на тэрыторыі мемарыяльнага парка на плошчы Свабоды ў раённым цэнтры Карма Гомельскай вобласці.

Ганаровы грамадзянін пасёлка Карма.

**Па матэрыялах Музея гісторыі БДУ**

СВЯТКАВАННІ

# СВЯТЛО НЕЗГАСАЛЬНАЕ Ў СЭРЦЫ МАІМ

## Тыдзень беларускай мовы прайшоў у БДУ 21–25 лютага

***Па традыцыі Тыдзень беларускай мовы адкрыўся на філалагічным факультэце літаратурна-музычнай кампазіцыяй «Табе складаю шчыра свой санет, прапрадзедаў маіх жывая мова…». Гасцямі студэнтаў і выкладчыкаў сталі рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, дырэктар Інстытута мовы і літаратуры НАН Беларусі старшыня Міжнароднага камітэта славістаў Аляксандр Лукашанец, паэт Віктар Шніп і ўзорны фальклорны калектыў «Кветкі» СШ № 71 г. Мінска.***

Наступны дзень быў прысвечаны беларускаму правапісу. Перад студэнтамі выступіў Аляксандр Лукашанец, ужо як аўтар новай рэдакцыі «Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». Акрамя таго, студэнты пазнаёміліся з аўтарамі слоўніка «Сучасная беларуская мова» доктарам філалагічных навук Мікалаем Прыгодзічам і Валянцінай Раманцэвіч, а таксама з аўтарам вучэбна-метадычных выданняў па новай рэдакцыі «Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» кандыдатам філалагічных навук Уладзімірам Куліковічам.

23 лютага на факультэце адбылася пазнавальна-забаўляльная гульня «Філалогія і Я», у якой прынялі ўдзел студэнты 1 курса.

Наступны дзень прайшоў пад дэвізам «Беларуская мова за мяжой» – гэта тэма ўпершыню была абмеркавана ў рамках Тыдня. Са студэнтамі і выкладчыкамі пагутарылі старшыня Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, акадэмік НАН Беларусі і Цэнтральнай Еўрапейскай Акадэміі навукі і мастацтва, доктар гістарычных навук Міхаіл Касцюк і дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы Сяргей Запрудскі.

Завяршылася тыднёвая праграма 25 лютага Днём беларускага перакладу. Гасцямі факультэта сталі лаўрэат Міжнароднай літаратурнай прэміі імя Івана Франко і літаратурнай прэміі імя Кандрата Крапівы Валерый Стралко, а таксама паэт і перакладчык Анатоль Зэкаў.

Тыдзень беларускай мовы на філфаку прысвечаны Міжнароднаму дню роднай мовы, які адзначаецца 21 лютага па ініцыятыве ЮНЕСКА.

**Анстасія РАГАТКО**

***21 лютага абвешчаны ў свеце Днём роднай мовы. Студэнты Інстытута журналістыкі не засталіся ўбаку. І з 8 гадзін раніцы да 8 гадзін вечара будучыя журналісты паспелі паслухаць беларускую народную музыку, прыняць удзел у прэс-канферэнцыі «Новыя ўмовы для роднай мовы», паспрачацца з выкладчыкамі наконт двухмоўя ва ўніверсітэце ды патанчыць на вечарыне, пасля чаго яшчэ і падсілкаваліся нацыянальнымі стравамі. Далей пра гэта падрабязней.***

Інстытут журналістыкі ўпершыню ладзіў Дзень беларускай мовы з такім размахам.

Яшчэ з раніцы студэнтаў сустракалі дзяўчаты і хлопцы ў беларускіх народных строях. Ды не проста так, а з жывой музыкай ды падарункамі – налепкамі з сімволікай свята, а таксама са стужкамі для паненак і паясамі для юнакоў. Атрымаць падарунак можна было толькі пры адной умове: цэлы дзень ты мусіў размаўляць на роднай мове. Студэнтам гэта прапанова спадабалася, асабліва навучэнцам спецыяльнасці ваенная журналістыка, якіх было не адагнаць ад імправізаванага аркестра з баяна і бубнаў.

Святкавалі Дзень беларускай мовы ўсім журфакам. Ужо на першым перапынку ў дынаміках ва ўсіх кабінетах і аўдыторыях загучалі песні беларускіх народных ансамбляў.




Пачатковым мерапрыемствам стала прэс-канферэнцыя з удзелам саветніка міністра адукацыі па сувязях з грамадскасцю Віктара Іўчанкава, дырэктара Інстытута журналістыкі Сяргея Дубовіка і галоўнага дырэктара рэдакцыі замежнага вяшчання Беларускага радыё Навума Гальпяровіча. Студэнты і выкладчыкі абмеркавалі праблему папулярызацыі роднай мовы ў грамадстве, пытанні выкладання прадмета ў ВНУ, школах, а таксама праглядзелі відэаманіторынг жыхароў Мінска, які падрыхтавалі студэнты вэб-журналістыкі.

Пасля адбыліся дэбаты «Беларусізацыя ўніверсітэта: за і супраць». Нягледзячы на розныя меркаванні, усе пагадзіліся, што родную мову трэба ведаць, прычым пачынаць неабходна пераважна з сябе.

А скончыўся Дзень роднай мовы ў Інстытуце журналістыкі дэбютам студэнцкага тэатра журфака. Паспелі і паглядзець паказ беларускага адзення, і паслухаць песні на беларускай мове факультэцкіх гуртоў, і патанчыць пад «Лявоніху».

Асабліва пашанцавала пераможцам конкурсу па беларускай мове, які праводзіўся загадзя. 6 студэнтаў не толькі атрымалі ў якасці падарунка кнігі, але і сталі ўладальнікамі сертыфіката на «бонусны бал» на іспыце па беларускай мове ад Вольгі Самусевіч. Спрычыніліся да вечарыны і выкладчыкі. Віктар Іўчанкаў праспяваў песню, Інга Воюш прачытала ўласны верш, які асабліва спадабаўся дзяўчатам, ну і якое ж свята без анекдота! Пётр Дарашчонак ў чарговы раз выклікаў усмешку гістарычнай байкай.

Напрыканцы было прапанавана падсілкавацца дранікамі са смятанай і квасам. Тут ад ахвотных не было адбою…

Галоўны вынік Дня роднай мовы той, што студэнты сапраўды жадаюць размаўляць на беларускай мове, хочуць вывучаць яе глыбей. Нездарма некаторыя на наступны дзень прыйшлі на вучобу ў тых жа кашулях, каб толькі не здымаць падараваную ім налепку «Калі ласка, размаўляй са мной па-беларуску!»…

**Ксенія ЕЛЬЯШЭВІЧ**

АСОБЫ

# Мысляр сусветнага маштабу

*«БДУ для мяне – гэта дом родны, у якім усё, што б ні адбывалася, выклікае ў маёй душы самы жывы водгук. Я трапятліва стаўлюся да нашага ўніверсітэта. Без яго я не ўяўляю свайго жыцця. І сысці ад яго – тое ж самае, што сысці ад уласнага лёсу. На ўсіх этапах майго жыццёвага шляху Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт быў і застаецца для мяне сапраўдным калектыўным настаўнікам. І яшчэ: у глыбокім пакланенні перад універсітэтам я прывяду ўсім добра вядомыя радкі: «Настаўнік, перад імем тваім дазволь пакорліва схіліць калені».*

***Я. М. Бабосаў****, акадэмік НАН Беларусі*
*(Выпускнік БДУ 1955 г.)*

Час сам выбірае сваіх летапісцаў, філосафаў, паэтаў – тых, хто ў сваёй творчасці ў найбольшай ступені здолеў зразумець душу народа, раскрыць глыбінныя вытокі яго сілы. На мой погляд, такім чалавекам для Беларусі другой паловы XX і пачатку XXI стст. стаў мысляр сапраўды сусветнага маштабу акадэмік Яўген Міхайлавіч БАБОСАЎ, якому 23 лютага споўнілася 80 гадоў! У яго шматлікіх навуковых працах асэнсоўваецца наша быццё, наша рэчаіснасць, наш час. Ён чалавек творчы, бясстрашны рыцар навукі, які, нягледзячы на жыццёвыя нягоды, цяжкасці і перашкоды, шукае свой «філасофскі камень».

Сёння ў краіне сярод гуманітарыяў прозвішча Бабосаў раўнацэннае знаку якасці. Яшчэ ў сценах БДУ выявіўся яго шматгранны талент. Ён выдатна вучыўся (ленінскі стыпендыят, пераможца ўсесаюзнага конкурсу навуковых работ), камсамольскі важак (сакратар камітэта камсамола, камандзір зводнага ўніверсітэцкага будаўнічага атрада на цаліне), удзельнічаў у мастацкай самадзейнасці (добра спявае, любіць класічную і сучасную музыку, разумее жывапіс), займаўся спортам (разраднік па лёгкай атлетыцы).

З узростам напружанасць жыцця Я. М. Бабосова толькі ўзрастала. Ужо паважны навуковец (акадэмік, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі), грамадскі і дзяржаўны дзеяч (работнік ЦК КПБ, дырэктар, дэпутат), Я. М. Бабосаў застаўся такім жа няўрымслівым, надзвычай занятым чалавекам, які заўсёды трошкі спазняецца, але пры гэтым вечна малады і здольны захапляцца. Яго дасягненні – вынік штодзённай працы над новымі праблемамі, якія нам пастаянна падкідвае зменлівы свет. Адказы на выклікі часу мы знаходзім у яго фундаментальных і глыбокіх навуковых артыкулах, манаграфіях, дакладах і выступленнях. Ён па-ранейшаму здзіўляе і прыцягвае ўвагу любой аўдыторыі.

У сваіх кнігах акадэмік Я. М. Бабосаў вяртаецца да філасофскага асэнсавання чалавечага быцця на новым вітку гісторыі, аналізу філасофска-метадалагічных праблем пазнання, раскрыцця новых аспектаў дыялогу навукі і хрысціянства, ролі культуры і ідэалогіі ў духоўным жыцці чалавека і народа. Цалкам у новым святле разглядаецца пытанні зацвярджэння суверэнітэту беларускай дзяржавы, глабальнае і нацыянальнае, наступствы сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу, прыярытэт чалавека ва ўмовах дамінавання нігілістычнага ўспрымання рэчаіснасці. У часам супрацьлеглых працэсах адзін аднаму негатыўных працэсах, крызісах і канфліктах, якімі суправаджаецца сучаснае жыццё, аўтар бачыць не толькі пагрозу жыццёва важным каштоўнасцям і асновам сацыяльна-эканамічнага развіцця, але і пазітыўную магчымасць вызвалення грамадства ад аджылых стэрэатыпаў, бачыць парасткі новай эфектыўнай дзяржавы.

Свет змяняецца, і акадэмік Я. М. Бабосаў адзін з першых ставіць пытанне пра неабходнасць распрацоўкі новых канцэпцый радыкальнай трансфармацыі сусветнай палітычнай і эканамічнай сістэмы. Ён смела гаворыць пра крах неаліберальнай мадэлі развіцця, трагедыі чалавека, які апускаецца ў віртуальны гульнявы свет, дзе маральныя арыенціры пачынаюць успрымацца як састарэлыя стэрэатыпы, у якім выслізгвае адрозненне паміж маральнасцю і амаральнасцю, і як «шчыгрынавая скура», звужаецца прастора рэальна дзейнай маралі. У гэтых умовах тым больш патрабуецца паўнавартаснае функцыянаванне нацыянальнай дзяржавы, дзе зусім па-іншаму ўспрымаецца роля культуры, навукі, рэлігіі і ідэалогіі.



У працэсе пераходу да інавацыйнага шляху развіцця істотна актуалізуецца значэнне навукі. За апошнія дваццаць гадоў пасля здабыцця Беларуссю свайго суверэнітэту многае змянілася ў гэтай сферы. Тут ёсць шмат станоўчых момантаў, але нямала і спрэчных пытанняў. Акадэмік Я. М. Бабосаў з болем піша пра тое, як істотна знізілася матывацыя навуковай дзейнасці, падае яе рэйтынг у вачах моладзі, ёсць цяжкасці фінансавання навуковых праектаў, ідзе няпросты працэс змены пакаленняў. Аднак і ў новых умовах інавацыйнае развіццё немагчымае без навуковага суправаджэння, без асэнсавання новых мадэляў і варыянтаў руху наперад, тым больш без прагназавання сацыяльных наступстваў рашэнняў, што прымаюцца кіраўніцтвам.

Акадэмік Я. М. Бабосаў – энцыклапедыст, чалавек з шырокім кругаглядам, які добра ведае гісторыю сусветнай і айчыннай філасофскай думкі, культуры, літаратуры і мастацтва, рэлігіі.

Праз усю яго творчасць праходзіць беларускі кантэкст. Ён шчыра заклапочаны станам нацыянальнай культуры і таму адкрыта заклікае сваіх суайчыннікаў дамагацца, каб беларусы сталі ва ўмовах глабальнай інтэграцыі «больш беларускімі», каб у поўнай меры захоўвалі і прымнажалі тое, што вялікі пясняр беларускага народа Янка Купала называў «беларушчынай». Акадэмік Я. М. Бабосаў піша пра філасофскую дактрыну Францыска Скарыны як родапачынальніка Рэнесансу ў Беларусі, разглядае філасофскія і сацыякультурныя аспекты беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, ідэалогіі беларускай дзяржавы.

Пачуццё новага ніколі не падводзіла акадэміка Я. М. Бабосова. Аўтар малюе ўражальную панараму сапраўды гістарычных падзей, драматычныя калізіі новага часу, грандыёзныя перспектывы для лёсаў людзей і нашай агульнай планеты. Я. М. Бабосаў – аптыміст па натуры, і сваёй творчасцю ён заражае чытачоў, перадаючы ім уласныя погляды, разуменне жыцця, навуковы багаж і жыццёвы вопыт. Але пры гэтым ён застаецца дагэтуль не разгаданым і таму яшчэ больш прыцягальным і чытэльным аўтарам.

Здароўя Вам і новых творчых здзяйсненняў, дарагі Яўген Міхайлавіч. Хочацца верыць, што Ваша галоўная кніга яшчэ наперадзе і абавязкова будзе напісана…

**Прафесар Аляксандр ДАНІЛАЎ,**
**загадчык кафедры сацыялогіі**

СВЕТ ЗАХАПЛЕННЯЎ

*Вольга ГЕРАСІМОВІЧ:*

# «Шахматы – гэта выдатная гімнастыка для розуму!»

***БДУ – унікальная краіна ведаў, дабра вядомая ў свеце. Кожны, хто далучыўся да ўніверсітэцкай скарбонкі ведаў, нясе адмысловае святло, якое, нібыта чароўны ліхтарык, свеціць усё жыццё. Дзевяностагадовая гісторыя альма-матар – нібы мазаіка, складзеная з рознакаляровых і незвычайных агеньчыкаў. Хто творцы гэтай непаўторнай прыгажосці? У кожнага – свая гісторыя, свой твар. Адной з такіх яркіх фігур з'яўляецца гросмайстар Вольга ГЕРАСІМОВІЧ – магістр філалагічных навук, аспірантка кафедры сацыялогіі журналістыкі і малады выкладчык Інстытута журналістыкі.***



Мы сустрэліся з Вольгай на фінальным турніры па шахматах сярод факультэтаў БДУ. Яе ўдзел стаў сапраўдным упрыгожаннем турніру і дапамог камандзе Інстытута журналістыкі дамагчыся ганаровай нічыёй з нязменным чэмпіёнам – фізфакам і заняць другое месца на спартакіядзе БДУ.

***– Вольга, ваш удзел надаў універсітэцкім спаборніцтвам высокі ўзровень… А што для Вас шахматы?***

– Дзякуй, мне вельмі спадабалася ўдзельнічаць у спаборніцтвах. Шахматы – цікавая і захапляльная гульня, цудоўны спосаб правесці вольны час. Як аднойчы сказаў дзявяты чэмпіён свету Тыгран Петрасян, «шахматы – гэта па форме гульня, па змесце – мастацтва, а па цяжкасці авалодання гульнёй – гэта навука». Гэты афарызм вельмі дакладна вызначае маё ўспрыманне гульні. Мне падабаецца змагацца за дошкай, і асабліва задавальненне атрымліваеш, калі праводзіш прыгожую камбінацыю, знаходзіш моцны ход. Не менш цікава і авалодваць тонкасцямі гульні. Хацелася б, каб навучылася гуляць у шахматы і магло ацаніць вартасці гульні як мага больш людзей. Вядома, далёка не ўсе будуць гуляць прафесійна, але карысць займеюць, я думаю, усе.

***– З развіццём інфармацыйных тэхналогій з'явілася шмат магчымасцяў для таго, каб бавіць вольны час: камп'ютарныя гульні, сацыяльныя сеткі… У чым перавагі шахмат у параўнанні з іншымі заняткамі?***

– Шахматы, на мой погляд, дапамагаюць прывесці да ладу думкі і пры гэтым займальна правесці час. Гэта выдатная гімнастыка для розуму! Акрамя таго, для аматараў шахмат гэта не толькі магчымасць згуляць партыю, праявіць творчыя здольнасці, але і пагутарыць, сустрэцца з цікавымі людзьмі.

Як паказалі даследаванні навукоўцаў за мяжой, гульня асабліва карысная для дзяцей. Вось нядаўна пачула навіну, што ў школах ЗША сталі выкарыстоўваць шахматы для навучання крытычнаму мысленню, а таксама для фарміравання самапавагі і ўпэўненасці ў сабе.

У некаторых рэгіёнах Расіі шахматы ўводзяцца ў якасці абавязковага ўрока ў школах. Напрыклад, у Калмыкіі пасля таго, як з'явіўся ўрок шахмат, паспяховасць вучняў значна павялічылася, а колькасць правапарушэнняў з боку непаўналетніх зменшылася. Я веру, што шахматы дапамагаюць супрацьстаяць негатыву, які запоўніў сучаснае інфармацыйна-забаўляльнае поле.

***– Якое месца, на Ваш погляд, займаюць шахматы ў жыцці універсітэта?***

– У БДУ моцныя шахматныя традыцыі. За апошнія 10 гадоў зборная універсітэта не раз перамагала і ўваходзіла ў тройку наймацнейшых у рэспубліканскіх універсіядах. Студэнты-шахматысты БДУ заваёўваюць права гуляць у чэмпіянатах Беларусі па шахматах, а ў 2007 г. жаночая каманда «Вектар БДУ» ўдзельнічала ў Кубку Еўропы сярод клубных камандаў. Сярод супрацоўнікаў таксама ёсць шмат моцных шахматыстаў.

Развіццё шахмат ва ўніверсітэце, на мой погляд, станоўча ўплывае на яго імідж як буйнога інтэлектуальнага цэнтра. Было б выдатна правесці прымеркаваны да 90-годдзя БДУ шахматны турнір, запрасіць даць сеанс адначасовай гульні выпускніка ўніверсітэта – вядомага міжнароднага гросмайстра Віктара Купрэйчыка.

***– Вольга, а ў Вас ёсць яшчэ якое-небудзь хобі?***

– Шахматы для мяне значаць нашмат больш, чым хобі. Гэта важная частка майго жыцця. Хоць цяпер я і не прафесіянал у тым сэнсе, што не зарабляю гульнёй грошы.

Калісьці я займалася гімнастыкай, бальнымі танцамі. Зараз амаль увесь вольны час пасля працы выкладчыкам на кафедры сацыялогіі журналістыкі я прысвячаю падрыхтоўцы кандыдацкай дысертацыі, і на хобі застаецца зусім мала часу. Мне вельмі падабаецца вывучаць навуковую літаратуру і даследаваць, як сродкі масавай інфармацыі асвятляюць разнастайныя канфлікты. Але і ад навукі трэба адпачываць, таму я часам гуляю ў шахматы ў інтэрнэце, вучуся танцаваць сальсу, займаюся ёгай.

**Юлія САЙГАНАВА**

## НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

Завяршыліся спаборніцтвы ў рамках праграмы «Інтэрнатаўскія спрэчкі» Кубка дырэкцыі Студэнцкага гарадка БДУ сярод студэнцкіх саветаў інтэрнатаў БДУ па шасці відах спорту. Першае месца заняў студэнцкі савет інтэрната № 2. Другое і трэцяе падзялілі паміж сабой студэнты, якія пражываюць у інтэрнатах № 1 і № 11.

* * *

У перыяд з 9 па 15 сакавіка ў інтэрнатах БДУ будуць праведзены справаздачна-выбарчыя канферэнцыі па абранні новых складаў студэнцкіх саветаў інтэрнатаў.

* * *

17 сакавіка ў 19.00 у актавай зале ліцэя БДУ (вул. Ульянаўская, 8) адбудзецца шоу-конкурс «Зорная пара». Конкурс праводзіцца адзін раз на два гады і з'яўляецца адным з самых папулярных мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў рамках фестывалю студэнцкай творчасці Студэнцкага гарадка БДУ.

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# Працоўнае лета–2011

***Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт працягвае традыцыю студэнцкіх атрадаў. Сёлета дзейнасць пашыраецца адразу ў некалькіх напрамках.***




З 21 лютага пачынаецца прыём заявак ад студэнтаў на ўдзел у будаўнічых, сельскагаспадарчых, педагагічных, валанцёрскіх, краязнаўчых і сэрвісных атрадах.

Поўным ходам ідзе дамоўная кампанія з арганізацыямі і прадпрыемствамі па арганізацыі дзейнасці студэнцкіх атрадаў. Распрацоўваецца палажэнне аб студэнцкіх атрадах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Улетку гэтага года студэнты БДУ будуць працаваць на знакавых будоўлях краіны: рэканструкцыі будынка тэатра імя Я. Купалы, будаўніцтве спартыўна-забаўляльнага комплексу «Чыжоўка-Арэна». Студэнты будуць прымаць удзел у ключавых рэспубліканскіх праектах, такіх як «Музей Вялікай Айчыннай вайны», будуць задзейнічаны ў прыёмнай кампаніі БДУ, на сельскагаспадарчых работах, будуць працаваць у дзіцячых аздараўленчых лагерах Мінска ў складзе педагагічных і сэрвісных атрадаў.

Удзел у студэнцкіх атрадах дазволіць студэнтам не толькі істотна зарабіць, але і з карысцю правесці час, пазнаёміцца з новымі людзьмі, атрымаць карысныя навыкі.

Аформіць заяўку можна ў к. 202 галоўнага корпуса БДУ.

Даведкі па тэл. 209-50-59, 209-55-59;
пр-т Незалежнасці, 4 (галоўны корпус),
к.207, упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю,
к.202, студэнцкі цэнтр занятасці БДУ

**Старшы інспектар упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю Рыгор ПАСРЭДНІК**

# Па здароўе – да нас!

***Студэнцкі санаторый-прафілакторый прапануе шырокі спектр розных метадаў лячэння і аздараўлення студэнтаў:***

- вітамінапрафілактыка;
- паўнавартаснае харчаванне па талонах у студэнцкіх сталовых;
- аздараўленне і лячэнне адварамі траў;
- інгаляцыі;
- лячэбны масаж;
- водалячэнне;
- электралячэнне;
- святлолячэнне.

Аздараўленне ў студэнцкім санаторыі-прафілакторыі павысіць супраціўляльнасць арганізма вірусным інфекцыям, дапаможа дамагчыся ўражлівых вынікаў у аздараўленні ўласнага цела і духу.

Пуцёўку ў студэнцкі санаторый-прафілакторый можа набыць кожны студэнт, магістрант бюджэтнай або платнай, але толькі дзённай формы навучання. Пуцёўка выдаецца 1 раз у каляндарны год.

Для атрымання пуцёўкі ў аддзел сацыяльнай работы ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю (пр. Незалежнасці, 4, каб. 204, тэл. 209-52-75) неабходна падаць:

- заяву на імя старшыні камісіі па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні з указаннем тэрміну заезду і завізаваны дэканам (намеснікам дэкана) факультэта;
- медыцынскую даведку аб стане здароўя формы 1 здр/у-10 (бярэцца ў тэрапеўта па месцы жыхарства);
- квітанцыю аб аплаце кошту пуцёўкі. Аплата ажыццяўляецца ў ААТ «Белінвестбанк» (вул. Бабруйская, 9). Кошт пуцёўкі – 64 430 рублёў.

Графік заездаў у студэнцкі санаторый-прафілакторый у 2011 г.: 21.03 – 10.04; 13.04 – 05.05; 10.05 – 30.05; 01.06 – 21.06; 23.06 – 14.07; 08.09 – 28.09; 03.10 – 23.10 (за выключэннем святочных дзён).

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

28 лютага 2011 года
Падпісана да друку 25.02.2011 г.
Зак. . Тыраж 2000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

**Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*